ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 206 (1475) | СУБОТА, 5 верасьня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

ЗАЎТРА 17 МЮД

Рэвалюцыйная моладзь—да рэвалюцыйнага агляду

Чырвоныя сьцягі і лістоўкі на вуліцах Вільні

Вільня, 4. У сувязі з надыходзячым 17 Міжнародным Юнацкім Днём рабочая моладзь Вільні рыхтуецца да яго ўзнаўмаваньня. Па галоўных вуліцах гораду часта зьяўляюцца вывешаныя чырвоныя сьцягі і раскіданыя комсамольскія лістоўкі. Гэтымі днямі былі вывешаны некалькі чырвоных сьцягаў на Анжэкольскай вуліцы гораду, дзе была таксама раскідана комсамольская літаратура.

Забастоўка ў Таргоўку скончылася перамогай рабочых

ВАРШАВА, 4. Гэтымі днямі скончылася забастоўка рабочых фабрыкі штучных угнаеньняў у Таргоўку (Польшча), якая выбілася з прычыны 25 проц. зьніжэньня заработнай платы рабочым. Забастоўка працягвалася 4 дні і праходзіла надзвычай бурна. 3 прычыны гэтага, прадпрыемствы былі прымушаны згадзіцца на дамаганьні рабочых. Такім чынам, забастоўка скончылася перамогай рабочых.

Супроць зьверстваў над нашымі і вашымі братамі

Таварышы па клясе і барацьбе

Комсамолія і рабочая моладзь Ляйпэншнайдэра (Лейпцыг)

(3 ліста рабочае моладзі заводу імя Варашылава)

Да 17 МЮД, паціскуючы руку „Рот фронт", мы ведаем вам паведаміць, што наш завод 10 год таму назад быў маленькім саматужным майстэрняй з колькасьцю рабочых 100 чал.

3 тае пары мінула 10 год. Ідучы пад правільным кіраўніцтвам комуністычнае партыі і яе ЦК, на чале з тав. Сталіным, мы маем зараз не майстэрню, а машынабудаўнічы чырвонасьцяжны завод імя Клімы Варашылава. За бязьмежную ўдарную работу мы атрымалі узнагароду—

ордэн Чырвонага Працоўнага Сьцягу

Мы зараз маем на заводзе 1400 рабочых. 3 іх—600 чалавек рабочае моладзі, якая зьяўляецца актыўным, прыналежным удзельнікам у выкананьні бальшавіцкага пляну—пяцігодкі ў чатыры гады. Мы маем 18 маладзёжных ударных брыгад і 5 вытворчых комун.

Мы на заводзе маем 14 насьценгазэт і адну друкаваную заводскую газэту. У гэтых газэтах удзельнічае 400 рабочых карэспандэнтаў, з іх 320 карэспандэнтаў з рабочай моладзі.

Агульнымі сіламі наш комсамольскі колектыў быў у першых радох на рэалізацыі пазыкі 3-га, рашаючага году пяцігодкі. Усе комсамольцы падпісаліся на месячны заработак.

Разам з станоўчым выкананьнем у нашай рабоце, мы ўсё-ж маем прарыў у выкананьні прамфінпляну за апошнія тры месяцы. Але, напружаючы ўсе свае сілы, усю сваю ўвагу, на аснове разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, гэты прарыў будзе ліквідаваны. Праабражэньне краіны—мы павінны. Праабражэньне тэмпаў рашаючага году пяцігодкі будзе выканан. У нас, у краіне саветаў, няма беспрацоўя.

У нас існуе вольная, соцыялістычная праца

Мы ведаем, мы памятаем, што толькі 1/6 частка сьвету—краіна Саветаў—жыве і ўмацняецца, будуе ўсё соцыялізму. У 5/6 частках сьвету, там, дзе вы знаходзіцеся, існуе і пануе капітал, пануе фашысцкі тэрор.

Мы ня можам прайсьці міма жудасных зьверстваў польскага фашызму. Фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыйных рабочых і сялян у турмах фашысцкае Польшчы, увядзеньне новага турэмнага рэгляманту праследуе ня толькі мэту задушыць рэвалюцыйны рух, але-ж і падрыхтаваць антысавецкую інтэрвэнцыю. Гэты крывавы тэрор выклікаў магутнае абурэньне сярод шырокіх працоўных мас Савецкай Беларусі. Працоўныя БССР організуюць масавыя дэмонстрацыі протэстаў, дапамогу політвязьням фашысцкіх казэматаў. Мы заклікаем вас протэставаць супроць зьверстваў фашысцкіх разбойнікаў, супроць зьдзекаў над нашымі і вашымі братамі.

У вас налічваюцца дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, кінутых на галодную сьмерць. Сем'і галадаюць. За няплату кватэрнае платы выкідаюць на вуліцу, на волю лёсу. У вас прымусовая праца.

Сродкі ад экспляатацыі ідуць у кішэні буржуазіі.

Аб усіх вашых пакутах мы ведаем. Але мы таксама ведаем і тое, што вы, як частка ўсёе рабочае клясы, усёй рабочае клясы сьвету, рэвалюцыйная частка, вядзеце пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі Нямеччыны непрымірымую барацьбу з ярмом капіталу.

Мы ведаем, што вы ўжо на раз сваёй гэроічнай барацьбою давялі сваю адданасьць сусьветнаму Чырвонаму Кастрычніку—Комунізму.

Ведайце, што вы не адны. Мы ўсе з вамі.

Мы—плоць ад плоці, кроў ад крыві прасякнуты гашай нястомнай рэвалюцыйнай барацьбою. Ня слухайцеся капіталу, ня слухайцеся сацыял-фашыстых. Яны, вас хочуць зьвесьці з дарогі, ня слухайцеся зьвараў буржуазіі. Усё, што «мы гаворым і пішуць пра нас, усё гэта хлусьня і паклёп, яны адцягваюць вашыя думкі ад рэвалюцыйнага руху. Прыяжджайце да нас і вы ўбачыце самі ўсё, чаму тое, што робіць рабочая клясa Савецкага Саюзу. Мы жадаем у далейшым весьці сталую сувязь з вамі. Спадзяемся вам перадаць наш рэвалюцыйны вопыт, набыты за 14 год існаваньня Савецкае улады.

Мы мы вам шлём чырвоны сьцяг, які мы моцна трымаем пад кіраўніцтвам УсеКП(б), пад кіраўніцтвам КІМ'у. Пад чырвоным сьцягам мы пойдзем на рашаючую барацьбу за завяршэньне будаўніцтва соцыялізму.

Выступайце ў дзень 17 МЮД'у супроць новай крывавай вайны. Выступайце супроць зьверстваў польскага фашызму. Выступайце супроць уціску і эксплёатацыі рабочае клясы і працоўнага насельніцтва.

Выступайце ў абарону Савецкага Саюзу—бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту.

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік! Няхай жыве штаб пролетарскай рэвалюцыі—Ш Комуністычны Інтэрнацыянал! Няхай жыве ЦК УсеКП(б) і Сталін! Няхай жыве КІМ!

Рабочая моладзь заводу імя Варашылава

Сьледуе 530 подпісаў

Паліцэйскі налёт на дом імя К. Лібкнэхта (Нямеччына)

У фонд дапамогі братом

— Старшыні калгасу Дубровенскага р-ну організавалі чырвоныя абозы і адлічылі 1 проц. месячнага заработку. Тут-жа сабрана 9 р 87 к.

— Рабочыя Магілёўскага хлебазаводу сабралі 200 р.

— Моладзь з Мезрыцкаўскага колгасу аддала 1 дзень на ўборку лёну.

— Грузчыкі Гомель-гасп. абавязаліся выканаць плян асеньняй... перавазак.

— Колгасьнікі колгасу „Чырвоны партызан" Гомельскага р-ну павялічваюць пасеўную плошчу на 20 проц. супроць леташняй.

— Студэнты сельска-гаспадарчага барысаўскага тэхнікуму абавязаліся сабраць 3000 р. 250 р. ужо здана.

— Моладзь пагельнага заводу № 8 абавязваецца ліквідаваць запазычанасьць па вырабу цэглы.

— Рабочыя шклянай ф-кі імя Дзяржынскага правадзяць дэкадьнік барацьбы ідаюцца ў рады МОПР'у.

— Адначасова піонэры Менскага піонэрскага дому адпачынку сабралі 64 р.

— Рабочыя мэблевай абутковай ф-кі высунулі сустрэчную лічбу на кампаніі зборах дапамогі—1000 р. Ужо сабрана 750 р.

— Рабочыя Рачыцкай запалкавай фабрыкі „Дняпро" і „10 Кастрычніка" ўзяліся за ліквідацыю прарыву ў прамфінпляне і ўсе ўступілі ў рады МОПР'у.

— Удзельнікі, ко фэнцыі сельска-гаспадарчых спэцыялістых, як адбылася ў Маі све—пастанавілі ўнесьці аднадзённы заработак у фонд дапамогі політзьняволеным Польшчы.

— Колгасьнікі колгасу „Новае жыцьцё" Крычаўскага раёну организавалі чырвоны абоз з 79 пуд. хлеба.

— Рабочыя шоўкавай ф-кі (Магілеў) унасьлі 2.500 р.

Організаваць калёны адыходнікаў для прамысловасьці

Гіганцкі рост соцыялістычнай прамысловасьці, пабудоў і транспорту патрабуе нясупыннага усё большага прытоку рабочае сілы. Толькі ў адным трэцім квартале бягучага году мы павінны даць нашай прамысловасьці 3 мільёны рабочых, з якіх звыш 2 з пал. мільёнаў прыпадае на вёску.

Між тым. прыток рабочых за апошні час рэзка адстае ад патрэб соцыялістычнай гаспадаркі. Гэта адставаньне наглядаецца ў радзе галін прамысловасьці і пры тым—рашаючых (камена-вугельная. мэталюргічная). Недахоп рабочае сілы пагражае стаць вузкім месцам ў іх разьвіцьці. Яшчэ горш з прытокам рабочае сілы ў сэзонных галінах прамысловасьці. Так, лесазагатоўкі па Саюзе былі забясьпечаны рабочаю сілай толькі на 40 проц., торпараспрацоўкі—на 76,5 проц. і пуціна—на 64 проц.

„Мы падарвалі ў корані расслаеньне вёскі, — стала быць, перамаглі тое самае жабрацтва, якое гнала селяніна з вёскі ў горад. Нарэшце мы забясьпечылі вёску дзесяткамі тысяч трактароў і сельскагаспадарчых машын, разьбілі кулака, організавалі колгасы і далі сялянам магчымасьць жыць пачалавецку. Зараз вёску нельга назваць мачыхай для селяніна. І менавіта таму, што яе нельга назваць мачыхай, селянін стаў асядаць у вёсцы. І ў нас ня стала болей ні „уцекаў мужыка з вёскі ў горад, ні самацёку рабочай сілы" (Сталін).

І так, крыніцы як я раней харчавалі самацёк, пры організацыі колгасаў ліквідаваны. Такім чынам справа адыходніцтва уступіла у новую паласу. Трэба ад „палітыкі" самацёку перайсьці да палітыкі організаванага набору рабочых для прамысловасьці.

Ці маюць магчымасьць колгасы організаваным парадкам забясьпечваць прамысловасьць рабочаю сілай і што трэба ведаць комсамольскай ячэйцы колгасу пры разгортваньні гэтай работы?

На гэта пытаньне даюць адказ Журавіцкія колгасьнікі ў сваёй адозьве да усіх маладых колгасьнікаў і адыходнікаў СССР—організаваць мюдаўскі прызыў рабочых у прамысловасьць. Яны пішуць: „Правільная расстаноўка рабочае сілы па брыгадах, увядзеньне брыгаднай сыстэмы,—усё гэта нам дало магчымасьць вылучыць для соцыялістычнай індустрыі 300 чалавек. Зьдзельшчына адыграла у нас рашаючае значэньне. Мы перавялі на зьдзельшчыну усе работы ў колгасе".

З гэтага вывад—дасканала улічыўшы працоўную сілу і патрэбы колгасу ў ёй, правільна організаваўшы працу на аснове брыгаднай сыстэмы і зьдзельшчыны, кожны колгас мае пэўныя магчымасьці даць прамысловасьці рабочыя рукі. А яшчэ трэба ўлічыць і тое, што ўкараненьне машын і мэханізацыя асобных процэсаў у сельскай гаспадарцы дае шырокія магчымасьці для організацыі адыходніцтва.

Колгасы БССР павінны даць для ўсесаюзнай качагаркі—Донбасу 9 тысяч рабочых. Вялікую колькасьць рабочых патрэбна кінуць і на дарожнае будаўніцтва, якое зараз разгортваецца на Беларусі. Комсамольская організацыя БССР на выклік Журавіцкіх комсамольцаў павінна разгарнуць шырокую масавую работу і забясьпечыць выкананьне програмы па адыходніцтву з колгасаў.

Як-жа комсамольская ячэйка зможа дабіцца пасьпяховага правядзеньня адыходніцтва?

Па-першае, трэба дакладна ўлічыць усе рабочыя рукі ў колгасе, улічыць патрэбы колгасу ў рабочай сіле, прыняць энэргічныя меры для поўнага пераводу ўсіх відаў работы ў колгасе на зьдзельшчыну, дабіцца правільнай растаноўкі рабочае сілы ў колгасе і выкарыстаньня машын. Шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, узьняць продукцыйнасьць працы.

Па-другое, шырока растлумачыць колгасьнікам ільготы, якія даюцца адыходнікам і колгасам. Растлумачыць, што нізкая працоўная нагрузка колгасьніка трымае прыбыткі колгаснага двара на штучна-нізкім узроўні, што ад правільнай організацыі работы ўзрасьце прыбытак колгаснага двара.

Па-трэцяе, рашуча змагацца з скажэньнямі лініі партыі і ураду ў пытаньнях адыходніцтва, выкрываць і біць па тых, хто тармозіць адыходніцтва (з фактамі выключэньня адыходнікаў з колгасу, пазбаўленьня іх ільгот, з прымусам адпрацоўваць нейкі лік працадзён у колгасе), адначасова організоўваць практычную дапамогу сем'ям адыходнікаў.

Вялікай адказнасьці задачы ў організацыі адыходніцтва з колгасаў ляжаць і на комсамольскіх ячэйках прадпрыемстваў. Трэба дабіцца, каб фабрыкі і заводы, як найхутчэй складалі дагаворы з колгасамі, устанавіўшы кантроль за выкананьнем іх. Падрыхтаваць сустрэчу колгасьнікаў на прадпрыемстве, організаваць работу па ўзьняцьцю іх кваліфікацыі, разгарнуць падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў непасрэдна ў колгасах, дабіўшыся складаньня дагавораў з двухбаковымі абавязацельствамі.

На гэтых умовах комсамол забясьпечыць пасьпяховае выкананьне адной з важнейшых шасьці задач, якія высунуты тав. Сталіным на нарадзе гаспадарнікаў.

ВЫКАНАНЬНЕМ СВАІХ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫХ ЗАДАЧ—ДАПАМОЖАМ БРАТОМ ПА ЗМАГАНЬНЮ

На 3.000.000 р. мопраўцы павінны рэалізаваць пазыкі „3-ці рашаючы" на вёсцы

З пастановы прэзыдыуму ЦК МОПР БССР

10.000 політзьняволеных Польшчы гэроічна змагаюцца з польскім фашызмам, супроць увядзеньня новага поліцэйска-дэфэнзыўнага рэгляманту. На ўсіх фашысцкіх засьценках Польшчы коціцца хваля масавых галадовак політзьняволеных, як пратэст супроць крывавага разгулу фашысцкіх катаў.

Сотні тысяч рабочых БССР патрабуюць безадкладнага спыненьня крывавых зьдзекаў над працоўнымі і політзьняволенымі ў турмах белапанскай Польшчы, патрабуюць вызваленьня рабочых і сялян, кінутых фашызмам у турмы за барацьбу супроць фашысцкага ўраду, вайны і голаду.

Працоўныя масы БССР даводзяць і давядуць на справе аб сваёй гатоўнасьці выконваць пролетарскі абавязак солідарнасьці з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Польшчы, Заходняй Беларусі. З усіх канцоў, з самых далёкіх кутkоў БССР—заводаў, колгасаў, саўгасаў, ад сялян—ад аднаасобнікаў, навуковых працаўнікоў і пролетарскага студэнцтва паступаюць протэсты з тысячамі рублёў адлічэньняў на дапамогу політзьняволеным Польшчы.

ЦК МОПР БССР, улічваючы вялікі энтузіязм працоўных мас БССР да справы дапамогі рэвалюцыянэрам у іх барацьбе з фашызмам, шляхам форсаваньня тэмпаў ўдарнай работай на прадпрыемствах, у колгасах і саўгасах у выкананьні і перавыкананьні пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі, ня можа прайсьці міма таго факту, што рэалізацыя пазыкі „3-ці рашаючы год пяцігодкі" вельмі слаба праходзіць на вёсцы сярод аднаасобнікаў і таму ЦК МОПР БССР бярэ на сябе абавязак дапамагчы пролетарскай дзяржаве ў рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў сіламі ўсяго актыву МОПР'у БССР на суму 3.000.000 руб. што зьяўляецца лепшым адказам на зьверствы польскага фашызму, што зьяўляецца лепшым выражэньнем пролетарскай солідарнасьці з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Польшчы ў іх барацьбе з урадам голаду і вайны.

ЦК МОПР БССР, бяручы на сябе гэту вялікую баявую і політычную задачу, заклікае ўсе організацыі МОПР'у, увесь актыў—мобілізавацца на пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё задачы рэалізаваць пазыку „3-ці рашаючы год пяцігодкі" сярод аднаасобнікаў. Уся работа павінна праводзіцца шляхам соцыялістычнага спаборніцтва паміж райкомамі і вясковымі ячэйкамі МОПР'у, пад лёзунгам: „Ніводнага працоўнага селяніна—аднаасобніка які-б ня купіў аблігацыі пазыкі на ўмацненьне індустрыялізацыі краіны". „Ніводнага аднаасобніка, які-б ня выканаў свой абавязак дапамогі".

РАПАРТ

Менскаму Гаркому КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, Гарадзкому савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

Ад Менскай організацыі Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі. 6-га верасьня—17 МЮД—31г.

12.000 ленінцаў баявой бальшавіцкай організацыі ленінскага комсамолу Менску, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, напярэдадні 17 МЮД'у магутнай, згуртаванаю вакол партыі і яе слаўнага ЦК, рапартуе:

Вырашаючы адказьнейшыя задачы ў дапамогу партыі ў час шырока разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсім фронце, Менская комсамолія ўвесь зьмест сваёй працы, юнацкі запал, творчы энтузіязм, бязьмежную адданасьць справе пабудовы соцыялізму з пэрыоду 16 па 17 МЮД аддала на павышэньне ролі комсамолу ва ўсёй сыстэме соцыялістычнага будаўніцтва.

95 проц. комсамольцаў ва ўдарных брыгадах—наш першы салют Гаркому КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і Гарсавету.

Змагаючыся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, колектывы КСМ у час падрыхтоўкі да міжнароднага юнацкага дня пака далі сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай работы па ўдзелу ў выкананьні народна-гаспадарчага пляну.

Колектыў Варашылава рыхтуе ў падарунак МЮД'у 2 варштаты і 4 цыстэрны імя 17 МЮДУ.

Колектыў „Полымя рэволюцыі" выпушчае звыш пляну вагоны.

Маладзёжныя брыгады заводу Варашылава, Комунар, Бальшавік, фабрык Абутковай, Кастрычнік, Шчотачнай, Комунаркі і інш. пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Ф-ка „Комунарка", якая нядаўна адчынілася, сустракае 17-ты МЮД організацыяй комсамольскага цэху імя 17-га МЮД'у.

Маладзёжная група ф-кі „8-га сакавіка" перавыканала прамфінплян на 20 проц. Акамсамолены ФЗВ швэйнікаў перавыканаў прамфінплян на 24 проц. Ф-ка „Комунарка" перавыканала плян на 10 проц. па ініцыятыве комсамольскага колектыву 50 брыгад пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Чырвонаштандарны завод „Бальшавік" перавыканаў на 10 проц. прамфінплян, Рымарная ф-ка плян перавыканала.

Рэалізуючы гістарычныя прамовы тав. Сталіна на 1-м і 2-м зьездах гаспадарнікаў, комсамол ва ўмовах Менску першым узьняў пытаньне аб організацыі масавага паходу за аўладаньне навукай і тэхнікай.

Задача сыстэматычнага кіраўніцтва паходам за навуку і тэхніку вырасьціла ініцыятыву КСМ організаваць маладзёжны Дом навукі і тэхнікі.

17-ты МЮД менскі комсамол сьвяткуе адчыняючы ў першы раз дзьверы ў гэтую грандыёзную консультацыю масавай работы па тэхніцы. Пералічваючы гэтыя работы, мы маем гонар давесьці да ведама Гаркому КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, Гарсавету, што мы здолелі орган зацыйна замацаваць увесь удзел комсамолу і моладзі на гаспадарчым фронце і таму значна павялічыліся рычагі партыі на кожным прадпрыемстве, ў саўгасе і колгасе.

6207 чал. новаўступіўшых у комсамол, 59 новых колгасных ячэек. Партасяродак у організацыі складае 12 проц., а ў рабочай часцы організацыі —да 20 проц.

Павышаючы сваю ролю ў гаспадарчым будаўніцтве, мы за час з 16-га і па 17-ты МЮД унесьлі пэўны уклад у справу нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Комсамольцы, займаючыся ў ВНУ, ВТНУ, ФЗВ, організуюць дапамогу партыі ў правядзеньні усеабучу, політэхнізацыі, аўладаньня белмовай і мовы нац. меншасьцяй у разгортваньні дабраахвотнага руху на вывучэньне беларускай культуры, організацыі мюдаўскага закліку ўдарнікаў ў літаратуру—вось факты якія сьцьвярджаюць аб павышэньні ролі комсамолу ў сыстэме культурнага будаўніцтва, соцыялістычнага па зьместу, нацыянальнага па форме.

Узмацняючы удзел ЛКСМБ у абароназдольнасьці краіны, комсамол Менску пасяаў лепшых комсамольцаў у школу морскога і паветранага флёту, організаваў па горадзе и вучальныя пункты, якія ахопліваюць комсамол вучобай. Усіх гэтых дасягненьняў дабіліся мы толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію ў КСМ, правільна злучаючы яе з актыўным уцягненьнем усёй масы комсамольцаў у штодзённую конкрэтную працу, памнажаючы яе на опэрацыйнае конкрэтнае кіраўніцтва.

Рапартуючы аб гэтых дасягненьнях, мы павінны адзначыць, што мы лічым зусім нездавальняючым і яшчэ далёка невыстарчальным наш удзел у выкананьні павышаных задач 3-га рашаючага году 5-ці годкі, асабліва ў пытаньнях масавага паходу за тэхніку, колгасна-саўгаснага будаўніцтва, што абавязвае нас яшчэ больш упарта змагацца пад кіраўніцтвам партыі за выкананьне народна-гаспадарчага пляну, за рэконструкцыю транспорту, колектывізацыю сельскай гаспадаркі, разьвіцьцё пролетарскай культуры

Сілы шмат, Упартасьці ня меней. Будзем у далейшым разам з партыяй і пад яе кіраўніцтвам браць вышыні соцыялістычнай будоўлі.

Менгарком ЛКСМБ.

У Чавусах ігнаруюць якасьць росту

Замацаваньне навічкоў—неадлучная частка барацьбы за шматмільённы

Дагэтуль яшчэ паасобныя ячэйкі і райкомы не зразумелі палітычнае сутнасьці росту. Факты ў Чавускага р-ну яскрава гавораць аб тым, што тут рост зразумелі як самамэту, а не як сродак для узьняцьця ролі комсамольскай організацыі і уцягненьня мільённых мас раб., батрацкай і колгаснай моладзі ў соц. будаўніцтва. Замацаваньню росту ані-якай ўвагі тут ня ўдзелена, не зважаючы на тое, што гэта неадымная частка барацьбы за шматмільённы. Трэба ўцягнуць усіх навічкоў у вытворчую і комсамольскую работу, ахапіўшы іх соц. спаборніцтвам, ударніцтвам і політвучобай.

Замацоўваючы рост і разгортваючы масава-растлумачальную работу на аснове індывідуальнага адбору, мы абавязаны ўзьняць тэмпы і якасьць росту.

Організавалі, на чым і спыніліся



Нядаўна ў колгасе „Іскра" (Чавускі р-н) організавана комсамольская ячэйка. Ячэйка яшчэ нічога конкрэтнага не зрабіла, бо фактычна існуе толькі на паперы. Яшчэ не наведаў ячэйку ніводзін прадстаўнік з райкому КСМ. Відаць, Чавускі райком зразумеў рост як самамэту, чым ляна ігнорує рост комсамолу.

Райком комсамолу павінен дапамагчы ячэйцы ўзяцца за работу на належную вышыню.

Я. Кіркароў.

Навічкі перавыконваюць нормы выпрацоўкі

У пачатку кантрольнага плянуму ЦК ЛКСМБ „Асьветніцкая" ячэйка (Любаньскі раён) налічвала ўсяго 18 комсамольцаў. У колгасе тады было каля 125 чал. батрацка-бядняцкае моладзі. Ячэйка ніякай работы па росту не праводзіла. Гэта справа была па-за ўвагаю ўсёй комсамольскай ячэйкі. Толькі пасьля рашэньня кантрольнага плянуму, ячэйка павяла шырокую масава-растлумачальную работу па популярызацыі рашэньняў IX зьезду і плянуму аб росьце.

Уся работа па росту ўвязвалася з барацьбою за пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі. У барацьбе за ўдарныя тэмпы ячэйка змагалася за рост. У выніку за апошнюю дэкаду ячэйка прыняла новых 24 члены і організавана новая ячэйка.

Аднак, на гэтым ячэйка не спынілася. Пасьля значных посьпехаў у росьце, уся ўвага ячэйкі была зьвернута на замацаваньне навічкоў і павышэньне ўдзелу комсамольскай ячэйкі ў вытворчым жыцьці колгасу. Практычна: была організавана скразная ўдарная брыгада з комсамольцаў і колгаснае моладзі, якая ў ўсім колгасе дасягнула перавыкананьня норм выпрацоўкі. Так,—на уборцы лёну норма на чалавека 0,03, а брыгада дала 0,04 га; на вязцы снапоў норма 0,25 га, а брыгада выпрацоўвала 0,3 га; жаць жыта рукамі норма—0,1 га, брыгада выпрацоўвала 0,2 га. На гэтай ударнай рабоце брыгада не спынілася, а організавала ў колгасе соцыялістычнага буксір. Туды, дзе гаспадары недавыконваюць нормы выпрацоўкі, комсамольская брыгада кідала свае сілы і паказвала ўдарныя тэмпы.

Аднак, ячэйка мае і значныя недахопы. Зусім слаба вядзецца работа сярод бядняцкае і лепшай часткі серадняцкае аднаасобнае моладзі, дзякуючы чаму ячэйка не вырасла за кошт гэтай моладзі ні на [illegible] чалавека.

Базарэйс.

Замацаваньне навічкоў—слабое месца

Ячэйка комуны імя Сталіна за апошні час значна ўзрасла. Гэты рост праходзіў у барацьбе за пасьпяховую ўборку. Аднак, з новымі комсамольцамі ніякай работы не праводзіцца. Ніякіх гурткоў не організавана. Навічкі не ахоплены якою-колечы конкрэтнаю работай. Да навічкоў падыходзяць так, як да старых комсамольцаў.

Ячэйка не зразумела, што справа не толькі ў тым, каб расьці, а галоўнае,—замацаваць гэты рост. Замацаваньне навічкоў павінна ісьці па лініі конкрэтнай нагрузкі кожнага навічка якою-колечы работай у колгасе і ячэйцы і ахопу ўсіх навічкоў політвучобай.

Барабанаў.

Рост на тормазох

Комсамольская ячэйка саўгасу „Фаніпаль" (Койданаўскі р-н) нічога ня робіць па пытаньню росту і падрыхтоўкі да МЮД'у. Ячэйка налічвае ўсяго 6 чалавек комсамольцаў, тады як у саўгасе значная колькасьць рабочае моладзі не ахоплена КСМ. Яшчэ не праведзена вытворчага сходу сярод рабочае моладзі па пытаньню росту і падрыхтоўкі да МЮД'у.

Раённы камітэт КСМ зьвяртае мала ўвагі на такія ячэйкі. Раён зараз колектывізаваны на 94 проц. аднак, работа комсамольскай організацыі ідзе па-старому. У райкоме не разумеюць, што зараз нельга так працаваць. Новыя абставіны і зьмены, якія прайшлі ў выніку суцэльнай колектывізацыі раёну, патрабуюць перабудовы комсамольскай работы.

Г-б.



Комсамольцы у падшэфным колгасе.

Мільён тон сілосу—ня менш

Шостага верасьня—дзень ударнае працы на сілосаваньню

„ЦК прапануе ўсім комсамольскім організацыям азнаймаваць правядзеньне мюдаўскага суботніку 100 проц. выкананьнем пляну сілосаваньня"
(З пастановы ЦК ЛКСМБ)

Пастанова

Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб усебеларускім суботніку па сілосаваньню, ад 23-VIII—31 г.

1. Прапанаваць комсамольскім організацыям уключыцца ў абвешчаны ЦК УсеЛКСМ усесаюзны мюдаўскі суботнік на сілосу.

2. РК і ячэйкам ЛКСМБ пераключыць праводзімы дэкаднік па ліквідацыі прарываў у сілосаваньні на сыстэматычную барацьбу за выкананьне сілосных плянаў і падрыхтоўку да мюдаўскага суботніка.

3. Прапанаваць таварышом, якія едуць ад ЦК ЛКСМБ у раёны, забясьпечыць належную дапамогу райорганізацыям у правядзеньні суботніка.

4. ЦК прапануе ўсім комсамольскім організацыям азнаймаваць правядзеньне мюдаўскага суботніка стопроцантным выкананьнем сілоснага пляну.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ
ПАЛЯКОЎ

Комсамольскі суботнік па сілосаваньню правалены

Выкананьне пляну сілосаваньня ў колгасе „1-га Мая"—Слуцкага р-ну зрываецца. Патрэбныя 900 тон не засілосаваны, бо ўся праца ідзе самапёкам.

Комсамольская ячэйка гэтай справай ня цікавілася. Сэкратар ячэйкі Шульман, калі яго запыталі аб кантрольнай лічбе, якая дадзена колгасу, сказаў, што і сам ня ведае.

Ячэйка не падрыхтавала пляну правядзеньня комсамольскіх суботнікаў па сілосаваньню.

Пабудова сілосных установак у надзвычайна дрэнным стане.

Комсамольская ячэйка і праўленьне колгасу павінны на хаду зрабіць пералом у справе сілосаваньня, наверстаць упушчанае і мобілізаваць масу на выкананьне кантрольных заданьняў.

Райкому КСМ патрэбна зараз-жа мобілізаваць комсамольскую організацыю на ліквідацыю прарываў у сілосаваньні, а таксама выдзеліць комсамольскія брыгады для дапамогі колгасам ліквідаваць гэтыя прарывы.

Пост „Ч. З." Вяроўка Т.
Новік Я.



Браць прыклад з перадавых

Комсамольская ячэйка колгасу „Комінтэрн" абавязалася сваімі сіламі засілосаваць ўсе, якія ёсьць ў колгасе сілосныя культуры і поўнасьцю выканаць заданьне. Гэтая абавязацельства ажыцьцяўляецца на практыцы. Ужо засілосавана 15 тон кармоў.

Уся праца праводзіцца мэтодамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Я. Жылка.

Заслаўская МТС сарвала суботнік сілосаваньня

На 23 жніўня комсамольская ячэйка саўгасу „Беларусь", Заслаўскага р-ну прызначыла комсамольскі суботнік па сілосаваньню з ўдзелам комсамольцаў і беспартыйнай моладзі колгасаў „Будзёнага" і „КІМ".

На суботнік зьявіліся усе комсамольцы, беспартыйная моладзь і саўгасныя рабочыя. Але, дзякуючы галаваццяпству кіраўнікоў. Заслаўская МТС прыслала сапсаваны трактар, які ня мог пакруціць сіласарэзкі. Такім чынам суботнік быў сарваны.

Мы, комсамольцы і рабочыя саўгасу „Беларусь" колгасаў „Будзёнага" і „КІМ", просім „Чырвоную Зьмену" і раённыя організацыі высьветліць гэтае пытаньне і вінавайцаў у зрыве комсамольскага суботніка па сілосаваньню прыцягнуць да суровай адказнасьці,

50 подпісаў.

За сілос змагацца па-ўдарнаму

Комсамольская організацыя саўгасу „Пакрашова" сапраўды апраўдала званьне шэфа над сілосам. Па ініцыятыве комсамольскай організацыі быў наладжаны суботнік, дзякуючы якому саўгас мае зараз 15 тон засілосаваных кармоў. Але на гэтым комсамол ня спыніўся. Скончыўшы закладку жнівеньскага сілосу, комсамольцы агульнымі сіламі ўзяліся за капаньне ямы для закладкі чэрвеньскага.

Трэба зазначыць, што адміністрацыя і рабачком зусім не зьвяртаюць увагі на будаўніцтва сілосных установак, ня гледзячы на тое, што матар'ял даўно ўжо загатоўлены.

Бязумоўна, дзьве ямы, запоўненыя сілоснаю масай, не забясьпечваюць выкананьня плянаў. Адміністрацыя саўгасу і рабачком павінны безадкладна разгарнуць будаўніцтва сілосных установак, каб забясьпечыць выкананьне кантрольных заданьняў па закладцы сілосу.

З. Е[illegible]вчык

Студэнты—на штурм прарыву

Слуцак. Разгорнутая па Слуцкім р-не кампанія ліквідацыі прарываў у сілосаваньні прыняла шырокі размах. З кожным днём у барацьбу за сілос уцягваюцца ўсё новыя і новыя масы. 150 студэнтаў Слуцкага тэхнікуму мобілізаваліся і 31-VIII разьехаліся па саўгасах

„Ч З" на Бабруйскім дрэваапрацоўчым | Указаньні Сталіна ў жыцьцё | Ніводнага граму хлеба прыватніку

Бальшавіцкі штурм прынёс перамогу

Выканаць 6 сталінскіх умоў—забясьпечыць далейшае замацаваньне заваяванага

ДАМО ДАМЫ ДОНБАСУ

Комсамольскай організацыі заводу „Інтэрнацыяʼнал" (Рэчыца)

Рэдакцыі „Чырвонай Зьмены"

Вы ня выконваеце сваіх абавязкаў

Дарагія таварышы! Праца цэху стандартных дамоў, які вытварае дамы для рабочых Донбасу, непасрэдна залежыць ад вашага заводу, бо ён забясьпечвае цэх цьвікамі. Ваш завод ня выканаў узятых на сябе абавязкаў. У выніку стандартны цэх комбінату 7 зьмен не працаваў. Вы зрываеце выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб хутчэйшым забясьпечаньні рабочых Донбасу жыльлём, што адбіваецца на працы ўсесаюзнай качагаркі, а адсюль і на астатніх галінах нашай прамысловасьці.

Комсамольская ячэйка стандартнага цэху комбінату мобілізавалася на ліквідацыю прарыву ў цэху, але мы знаходзімся ў непасрэднай залежнасьці ад вашай працы. І таму мы зьвяртаемся да ўсёй комсамолі і працоўнае моладзі заводу „Інтэрнацыянал": прымеце ўсе захады для бесьперабойнага забясьпечаньня нашага цэху цьвікамі.

Мы ўпэўнены, што у адказ на наш ліст, вы разгорнеце ўсёй комсамольскай організацыяй вашага заводу шырокую практычную працу і будзеце змагацца за выкананьне прамфінпляну. Мы разам адказваем за выкананьне пляну.

По даручэньню агульнага сходу ячэйкі ЛКСМБ стандартнага цэху Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату, сэкратар камітэту ЛКСМБ—ГОЛАД, сэкратар ячэйкі—РАК.

ШКІЛЕТЫ ЗАМЕСТ ДАМОЎ

Стандартныя дамы трэба будаваць з высушанай драўніны. Аднак, стандартны цэх Бабруйскага комбінату не зварочвае ніякай увагі на вільготнасьць матар'ялу. Адміністрацыя цэху ніколі не правярае якасьці драўніны. У выніку Донбас ня прыняў значнай колькасьці дамоў. Яны былі больш падобныя на драўляныя шкілеты, чымся на дамы.

Вінаватыя ў такім злачынстве павінны адказаць за пасланы матар'ял, рабочы час і экспортоўку негодных вырабаў на Донбас.

Цэх стандартных дамоў павінен выканаць плян: забясьпечыць Донбас дамамі добрае якасьці.

Рабочы цэху стандартных дамоў А. ПАХОНЫ.

Да ўсіх комсамольскіх організацый БССР

Заўтра 17 МЮД

Перабудоўваючы сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі, з новай абстаноўкаю, комсамольская організацыя Беларусі да 17 МЮД'у яшчэ больш вырасьлі і загартаваліся, ўзмацнілася барацьба супроць права-опортуністычных самацёку, наносячы рашучыя ўдары па „левых" загібшчыках, ленінскі комсамол разгортвае барацьбу за шматмільёны.

Многія комсамольскія організацыі яшчэ не перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з указаньнямі т. Сталіна. Слаба яшчэ разгорнута барацьба за ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі, за організаваны набор рабочае сілы, за зьдзельшчыну і гаспадарчы разрахунак. Комсамол не ўзначаліў на дасягнутым ім выдатных посьпехаў, яшчэ невыстарчальна разгарнуў барацьбу за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў БССР.

Зьдзельшчына ўкараняецца ў колгасах і саўгасах недапушчальна марудным тэмпам. Адсюль і неахопы на фронце ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы.

Мы зьвяртаемся да ўсіх комсамольцаў і маладых рабочых заводаў і фабрык БССР:

—У дзень 17 га МЮД'у організуйце комсамольскія брыгады, якія-б праверылі і дабіліся сапраўднага ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ў кожны цэх, агрэгат брыгаду.

—Праверце, як на вашым прадпрыемстве ліквідуецца абязьлічка і ўраўнілаўка, дабецеся, каб гэтыя тормазы вытворчасьці былі неадкладна і поўнасьцю зьнішчаны. Змагайцеся за выкананьне сустрэчн -зьменных плянаў, за тое, каб ні адзін варштат, ні адна машына ня былі абязьлічанымі, каб аплата працы знаходзілася ў поўнай адпаведнасьці з кваліфікацыяй рабочых, асабліва па вядучых профэсіях.

—Організуйце дагаворы з падшэфнымі колгасамі па адыходніцтву. Няхай кожная комсамольская організацыя практычна абмяркуе гэта пытаньне і разам з комсамольцамі колгасаў дабʼецца організаванага і сыстэматычнага набору рабочае сілы для свайго прадпрыемства.

Разгарнеце сапраўдную барацьбу за паляпшэньне культурна-бытавых умоў рабочых мас, за чысты і культурны барак, за гігіенічную сталоўку, за перабудову работы коопэрацыі.

Мы зьвяртаемся да ўсіх комсамольцаў саўгасаў, колгасаў і машынатрактарных станцый;

—Дабецеся, каб у кожным колгасе былі неадкладна ліквідаваны абязьлічка і ўраўнілаўка, каб у кожным колгасе была наладжана выразная організацыя і ўлік працы, выконваючы гэтым самым дырэктывы партыі аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў.

—Комсамольцы ільнаводных колгасаў і саўгасаў! Організуйце ільняны конвейер, каб ніводзін гэктар лёну не застаўся на палёх, і ня быў-бы недаапрацаваны.

—Комсамольцы колгасаў і саўгасаў! Дабецеся неадкладнага пералому ў будаўніцтве і гаспадарчым умацаваньні малочных і сьвінагадоўчых ферм, дабецеся абязьлічкі і ўраўнілаўкі ў жывёлагадоўчых гаспадарках, забясьпечце поўнае выкананьне дырэктыў партыі аб форсаваным разгортваньні жывёлагадоўлі, аб сілосаваньні 1.000.000 тон кармоў.

—Усе сілы на пасьпяховае завяршэньне ўборачнай кампаніі, асеньняй сяўбы, забліжага ворыва і хлеба-загатовак.

З свайго боку мы даем слова:

—На прадпрыемствах Менску, у цэхах і брыгадах організаваць выпуск штодзённых газэт, мобілізуючы праз іх рабочыя масы на барацьбу за рэалізацыю задач, указаных у прамове тав. Сталіна.

Організаваць сталы выпуск паляных штодзённых газэт у колгасах і саўгасах Койданаўскага раёну, мобілізуючы праз іх колгасныя масы на барацьбу за зьдзельшчыну, за організацыю і ўлік працы, супроць абязьлічкі і ўраўнілаўкі.

—Вылучыць з колектыву 10 комсамольцаў у дапамогу Менскаму Гаркому ЛКСМБ для ажыцьцяўленьня соцумовы з МенАПП-ам аб закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру. Дабіцца складаньня дагавароў 8 колгасамі Койданаўскага раёну з менскімі прадпрыемствамі на рабочую сілу. Уцягнуць усіх маладых беспартыйных рабочых нашай друкарні ў рады комсамолу. З усёй бальшавіцкай настойлівасьцю праводзіць у жыцьцё пастановы 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў. Замацуемся на сталую работу ў раённых газэтах. Перанясем вопыт масавай работы цэнтральных газэт па ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі—у раённыя газэты.

Колектыў ЛКСМБ цэнтральных газэт абавязваецца аўладаць вайсковай тэхнікай, а таксама ведамі вайсковага журналістага. Організаваць пры кожнай шматтыражцы і насьценгазэце сталы куток вайсковай работы, мобілізуючы ўсю грамадзкасьць прадпрыемстваў на абарону Савецкага Саюзу.

Мы абавязваемся ўзяць шэфства над адным з рабочых пасёлкаў г. Менску па конкрэтнай рэалізацыі задач, вызначаных чэрвеньскім пленумам ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні комунальнай гаспадаркі і шляхам выданьня спэцыяльнай кніжкі перадаць астатнім колектывам дасягнуты вопыт.

Колектыў ЛКСМБ цэнтральных газэт БССР

„Чырвоная зьмена" на Бабруйскім дрэваапрацоўчым

Да МЮД'у—ударны беладрэўны

Дошкі, звычайныя дошкі—у пачатку цэху. Белыя дзьверы, экспорт валюта—у канцы цэху. Беладрэўны цэх Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату—адзіны у СССР і пабудаваны па апошняму слову тэхнікі:

У цэху пераважна моладзь 85 проц. рабочых ва ўзросьце да 25 год. Загадчык цэху, сэкратар парткол ектыву, старшыня цэхкому—усе былыя комсамольцы. 65 проц. рабочае моладзі ва ўзросьце да 25 год.

Значная частка рабочых працуе спачатку пусву цэху. Астатнія—учарайшыя колгасьнікі сяляне.

Асноўная частка продукцыі цэху—экспорт. Яшчэ нядаўна цэх выпускаў толькі 10-15 проц. пляну.

На працягу амаль што году рабочыя цэху патрабавалі перайсьці ад сушкі дошак да сушкі гатовых дэталяй. Але былое опортуністычнае кіраўніцтва не хацела рызыкаваць. І толькі, калі прыехаў для працы практыкант паветранай акадэміі тав. Волскі і пытаньне было пастаўлена рубам,—рызыкнулі. Першы дзень сушкі дэталяй даў 80 проц. выкананьня экспортнага пляну.

Комсамольскі колектыў абвясьціў месячнік штурму.

— Гэта быў сапраўдны бальшавіцкі штурм,—гаворыць загадчык цэху тав. Кацнэльсон.—Цэх пачаў выконваць плян экспорту.

Але гэтага мала. Трэба пакрыць былую запазычанасьць краіне. І ўдарныя брыгады высоўваюць плян. Ён складаецца з пляну гэтага месяцу плюс былая запазычанасьць. Асобныя брыгады перавыконваюць і падвышаны плян.

У цэху штодзень новыя дзесяткі рабочых, шмат моладзі уступаюць у комсамол. Але яшчэ зараз не скарыстаны цалкам усе вытворчыя магчымасьці цэху.

Нарадзілася думка: у падарунак МЮД'у—ударны маладзёжны белцэх.

Большасьць рабочых у цэху добра ведае сваё месца. Асноўная праца цэху перанесена ў брыгаду. Толькі абязьлічка яшчэ цалкам не ліквідавана. З значных недахопаў: фармальнае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку ў цэху, адсутнасьць яго ў брыгадзе, значная цякучасьць рабочае сілы, дрэнная організацыя працы, адсутнасьць сапраўднай тэхнічнай вучобы. Гэта асноўныя перашкоды на шляху выкананьня прамфінпляну.

Рабочы колектыў цэху паставіў сабе мэту: шляхам поўнай бальшавіцкай рэалізацыі 6 сталінскіх умоў, да 17 МЮД'у выйсьці з палясы прарываў і стаць узорным цэхам. Гэтымі днямі пераводзіцца на гаспадарчы разрахунак адна зьмена і некалькі паасобных брыгад, уводзіцца прэміяльна-прогрэсыўная зьдзельшчына. Цэх рыхтуецца да сустрэчы 150 комсамольцаў, якія мобілі уюцца ЦК ЛКСМБ для працы у белцэху.

Задач цяжкіх і адказных шмат. Але, праца рабочага колектыву белцэху ў падрыхтоўцы да МЮД'у гаворыць за тое, што ўдарны рабочы колектыў пад кіраўніцтвам партыйнай організацыі і пры актыўнай дапамозе выязной рэдакцыі „Чырвонай зьмены" задачы выканае.

Э. Каганская.

Змагацца за плян загатовак,—за істужку чырвоных абозаў

Давесьці плян хлебазагатовак да вёскі, колгасу. Выявіць кулацка-заможніцкія гаспадаркі даць ім цьвёрдыя заданьні

Першыя абозы з хлебам

Раніца. Грукат калёс і нясупынны тупат коняй. На вуліцах Чэрвеня квітнеюць чырвоныя штандары, на калёсах груды мяшкоў, напоўненыя збожжам. Гэта колгасы Чэрвеньшчыны вязуць чырвонымі абозамі хлеб дзяржаве. Пляц перапоўнены людзьмі і фурманкамі. Роўна гадзіна. На трыбуне: сэкратар РК КП(б)Б т. Рай і сэкратар ЦК КП(б)Б т. Гей.

***

Першы мітынг, прысьвечаны чырвоным абозам першага абмалоту, адчыняе сэкратар РК КП(б)Б тав. Рай. Усе прамоўцы зьвяртаюць асаблівую ўвагу колгасьнікаў на правільнае разьмяркаваньне ўраджаю ў колгасах на аснове колькасьці і якасьці работы; на барацьбу з кулацтвам, якое імкнецца розным формамі і мэтодамі клясавай барацьбы падарваць нашае социялістычнае будаўніцтва; на ўкараненьне сапраўднай зьдзельшчыны на зьнішчэньне кулацкай ураўнілаўкі; на змаганьне за правільнае разьмеркаваньне ўраджаю, прытрымліваючыся адзінага пролетарскага прынцыпу: —„Хто не працуе, той ня есьць", а хто працуе, той павінен і больш атрымаць.

Колгасьнікі запэўніваюць, што з гонарам выканаюць пастаўленыя перад імі задачы, і ніводнага грама хлеба не дадуць прыватніку.

Пасьля мітынгу фурманкі з збожжам рушылі да складаў.

У чырвоным абозе прынялі ўдзел 19 колгасаў Чэрвеншчыны і 150 паадзасобнікаў. Колгасамі здадзена ў гэты дзень 17 тон збожжа, аднаасобнікамі 5 тон. Усяго здадзена дзяржаве хлеба першага абмалоту 22 тоны.

Міхась Ракіта.

Два чырвоныя комсамольскія абозы хлеба ў падарунак 17 МЮД

30-га верасьня ў Зембенскім сельсавеце, Барысаўскага раёну, былі організаваны комсамольскія мюдаўскія чырвоныя абозы, якія здалі дзяржаве 1675 клг. збожжа.

Організацыя чырвоных абозаў праведзена шляхам соцспаборніцтва між комсамольскімі ячэйкамі. У гэты-ж дзень адбылася конфэрэнцыя ўсёй моладзі Зембенскага сельсавету.

Працоўная беспартыйная моладзь і комсамольцы абавязалися організаваць другі мюдаўскі чырвоны абоз 6-га верасьня.

Работа па організацыі гэтага абозу праходзіць па ўдарнаму.

Агністы.

На аванпосты нарыхтовак

Пасьпяховае правядзеньне нарыхтоўчай кампаніі ставіць перад кожнай комсамольскай ячэйкай наступныя конкрэтныя задачы.

Разгарнуць работу па хутчэйшаму сканчэньню ўборкі, асабліва тэхнічных культур і абмалот ураджаю.

Кожная ячэйка павінна зараз-жа дабіцца, каб пляны ўсіх відаў нарыхтовак былі давдзены да кожнага колгасу, вёскі, двара. Ячэйкі павінны прыняць актыўны ўдзел у дапамозе сельскім саветам складаць нарыхтоўчыя пляны па сельсавеце. Гэтыя пляны трэба абгаварыць на сходах ячэек, колгасьнікаў і беднаты і на агульных сходах сялян.

На аснове социялістычнага спаборніцтва і ударніцтва дабівацца сустрэчных плянаў і датэрміновага выкананьня нарыхтовак колгасамі і аднаасобнікамі. Каб давесьці пляны да колгасаў і вёсак, трэба організаваць брыгады з комсамольцаў колгаснай і бядняцкай моладзі, якія прымацаваць да канца выкананьня пляну нарыхтовак да пэўнага пункту, ці вёскі.

У самы кароткі тэрмін ячэйка абавязана дабіцца каб цьвёрдыя заданьні па ўсіх відах нарыхтовак былі поўнасьцю давведзены да кулацка заможнай часткі вёскі. Праводзячы гэтую работу, неабходна сачыць, каб кулацка-заможная частка вёскі ў найкарацейшы тэрмін выконвала свае заданьні. Адначасова з гэтым кожная ячэйка павінна мець чуткі клясавы падыход, каб не дапусьціць перагібаў у адносінах да серадняцкай часткі вёскі.

Адным з важнейшых момантаў нарыхтовак зьяўляецца падрыхтоўка складаў і тары. Тут вялікую ролю могуць і павінны адыграць групы „ЛК", якія зараз-жа павінны праверыць падрыхтаванасьць складаў да прыёму і нарыхтоўчы апарат з пункту погляду яго клясавай пільнасьці і баяздольнасьці кіраваць нарыхтоўкамі, дабіваючыся чысткі гэтых органаў ад клясава-чужых элемэнтаў. Мы павінны вылзяліць у гэты апарат комсамольцаў, колгасьнікаў і беднату. Уся культурнамасавая работа ў час нарыхтовак павінна быць падпарадкавана хутчэйшаму сканчэньню ўборкі і нарыхтовак. Трэба організаваць спэцыяльныя культбрыгады па абслугоўваньню чырвоных абозаў, выпуску на пунктах насьценных газэт і іншай масавай рабоце.

Асабліва важная задача паўстае перад комсамольскімі організацыямі раёну тэхнічных культур. Тут уся работа комсамольскай организацыі павінна быць накіравана на забясьпячэньне своечасовай здачы сыравіны для прамысловасьці.

Пры кожнай ячэйцы трэба організаваць кантрольныя пасты па нагляду за сваячасовым абмалотам і адпраўкаю на пункт, за сваячасовым і правільным разьмеркаваньнем прамтавараў сярод здатчыкаў.

Гэтыя задачы будуць выкананы пры ўмове правільнай расстаноўкі комсамольскіх сіл і мобілізацыі шырокіх мас колгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, пры шырока разгорнутай масавай рабоце. Уся гэтая работа павінна быць накіравана на далейшае разгортваньне колектывізацыі, рашучую барацьбу з кулацтвам і яго агентурай—опортуністымі розных масьцей.

Г Фіялкін

ПРАВЕРЫМ ВЫКАНАНЬНЕ КОЛУМОЎ

На „Бальшавіку" ахова працы ў загоне

Практычная праца комсамольцаў заводу „Бальшавік" зьяўляецца прыкладам таго, як трэба разгортваць барацьбу на кожным паасобным вучастку выкананьня прамфінпляну. Зьмяшчаючы матар'ял, зьвяртаем увагу ўсіх комсамольскіх ячэек на неабходнасьць сыстэматычна правяраць выкананьне колумоў.

Колумова ня выконваецца

Комсамольская організацыя „Бальшавіка" распачала праверку выкананьня колумовы па заводзе. Па ўсіх цэхах організаваны комсамольскія брыгады, якія правяраюць стан выкананьня колумовы ў цэху, а таксама і адміністрацыяй заводу.

Ужо першыя дні працы брыгад высьветлілі, што ёсьць выпадкі, калі колумова ня выконваецца. Надзвычай дрэнна пастаўлена ахова працы, забясьпечаньня спэцвопраткай і г. д.

Гэтыя днямі брыгада канчае сваю працу і падвядзе вынікі, што дасьць магчымасьць зьнішчыць перашкоды на шляху выкананьня прамфінпляну чырвонаштандарным „Бальшавіком".

Кутман.

Памяці тав. Канчэўскага



Тав. Арсень Канчэўскі (Владэк Камінскі) нарадзіўся ў 1901 г. на Зах. Беларусі ў Вільні. Ужо ў раньняй маладосьці ён далучаецца да нацыянальна-вызваленчага руху на Зах. Беларусі. У 1922 г. ён уступае у рады падпольнай беларускай рэволюцыйнай організацыі і хутка становіцца адным з віднейшых яе кіраўнікоў і разам з другімі таварышамі падрыхтоўвае аб'яднаньне БРА з компартыяй ЗБ. З 1924 г. Владэк зьяўляецца членам ЦК КПЗБ і кіруе работай на вёсцы ва ўмовах Зах. Беларусі асабліва важкай.

Яму не ўдалося, аднак, разгарнуць на гэтай рабоце ўсіх сваіх сіл і здольнасьцяй. Ужо ў маі 1924 г. Владэка два разы арыштоўваюць і пасьля двухгадовага папярэдняга прабываньня ў турме ён асуджаецца да чатырох год катаргі.

На працягу ўсяго амаль пяцігадовага прабываньня ў польскіх турмах Владэк зьяўляецца прыкладам гэроічнай стойкасьці, самаахвярнай адданасьці рэволюцыі і бальшавіцкай дысцыплінаванасьці. Ва ўмовах турмы ён усё-ж вядзе рэволюцыйную дзейнасьць, змагаецца за чыстату партыйнай лініі і ўсямерна дапамагае ліквідаваць групу „сэцэсіі", якая ўзьнікла ў той час. За ўвесь час свайго прабываньня ў турме Владэк нязьменна кіруе побач з іншымі таварышамі барацьбой палітзьняволеных у Лукіскай, Вронкаўскай і Равіцкай турмах за палепшаньне турэмнага рэжыму.

Пасьля вызваленьня з турмы ў 1928 годзе Владэк па даручэньню партыі, зьяўляецца адным з кіраўнікоў рэволюцыйнага руху на Зах. Беларусі. Прасьледваўся паліцыяй і з дазволу партыі выяжджае ў СССР, дзе падрыхтоўваецца да далейшай рэволюцыйнай дзейнасьці.

Сьмерць вырвала тав. Владэка з радоў змагароў у момант асаблівага напружаньня клясавых баёў у Польшчы і Зах. Беларусі.

Памяць аб тав. Владэку—нястомным барацьбіту і адданым таварышу—будзе жыць у памяці рэволюцыйнага пролетарыяту і сялянства, якія давядуць да пераможнага канца тую справу, за якую Владэк аддаў лепшыя гады свайго жыцьця.

Часьць памяці тав. Владэка.

Польская сэкцыя Комінтэрну.

ЦК КПЗБ ад ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б выказвае свой глыбокі жаль і спачуваньне КПЗБ і яе цэнтральнаму камітэту з прычыны заўчаснай трагічнай сьмерці тав. А. В. Канчэўскага, члена ЦК КПЗБ.

Сьмерць тав. Владэка—цяжкая страта для комуністычнай партыі Заходняй Беларусі і для ўсяго рэволюцыйнага руху ЗБ і Польшчы яшчэ больш цяжкая гэта страта зараз, калі комуністычная партыя Заходняй Беларусі вядзе рабочых і сялян да рашучых баёў супроць дыктатуры фашызму, за пролетарскую рэволюцыю.

Брацкая КПЗБ цьвёрда пойдзе, пад кіраўніцтвам свайго цэнтральнага камітэту, да новых клясавых баёў, узначаліўшы масы пролетарыяту і сялянства, якія змагаюцца за сваё вызваленьне з пад ярма фашызму.

На месца тав. Владэка стануць новыя лепшыя барацьбіты за справу комунізму!

Мір ей рады, таварышы.

Няхай жыве комуністычны Інтэрнацыянал!

Няхай жыве брацкая КПЗБ і яе Цэнтральны Камітэт!

ЦК КП(б)Б.

Ад камісіі па організацыі пахаваньня тав. Канчэўскага А. В.

Пахаваньне адбудзецца сёньня 5-IX. Вынас цела з Дому Комасьветы на брацкія могілкі а 17 гадзіне. Доступ да цела для ўсіх адкрыт 5-га верасьня з 12 да 16 з пал. гадзін у Доме Комасьветы.

Камісія па організацыі пахаваньня тав. Канчэўскага заклікае замест вянкоў на магілу ўносіць сродкі ў фонд дапамогі палітзьняволеным ЗБ і Польшчы,

Барацьба за лепшае рабочае забесьпячэньне— СПРАВА ЎСЯГО КОМСАМОЛУ

Рэалізацыя рашэньняў партыі і ўраду, хутчэйшая перабудова спажывецкай коопэрацыі, павінна прынесьці пералом у рабочым забесьпячэньні

Час, які прайшоў з моманту пастановы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове спажывецкай коопэрацыі і палепшаньні грамадзкага харчаваньня, зусім дастатковы для таго, каб у корані перабудаваць працу коопэрацыйнай сыстэмы, адпаведна з пастановамі, і палепшыць якасьць грамадзкага харчаваньня.

Аднак, зьмешчаны сёньня матар'ял гаворыць аб тым, што ў Белкоопсаюзе, замест хуткага коопэрацыйнага кіраўніцтва забясьпечаньнем, маюцца факты бюрократызму і заціску самакрытыкі.

Матар'ял з Лёзны яшчэ раз пацьвярджае неабходнасьць узмацніць партыйнае кіраўніцтва работай коопэрацыі.

Перабудаваліся па-свойму

Лёзна. Дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове коопэрацыі практычна не ажыцьцяўляюцца Гарбоўскім сельпо.

„Нэпманскі душок", п'янкі, скажэньні клясавай лініі пры размеркаваньні дэфіцытных тавараў, абязьлічка—апанавалі сельпо. Усе дэфіцытныя тавары прадаюцца пры зачыненых дзьвярах „сваім людзям" Кіраўніцтва коопэрацыі засьмечана клясава-варожымі элемэнтамі. Загадчык крамы № 1—сын былога кулака. Загадчык крамы № 2—п'яніца, гамоньня Балотнікаў, рахункавод Лятоха—былы валасны пісар. Гэты букет выпадковых людзей не зацікаўлены у перабудове Гарбоўскага сельпо.

Адпаведныя органы павінны праверыць работнікаў Гарбоўскага сельпо.

Міхась Васковы.

Два месяцы валакіты

Перабудова апарату БКС у адпаведнасьці з пастановамі ЦК, СНК і і Цэнтрасаюзу, праходзіць марудна. Аб гэтым яскрава гаворыць наступны факт:

11 мая вайскова-коопэрацыйны сэктар БКС атрымаў з сапёрнае часткі (Н. Барысаў) заяўку на харчы.

Заяўку, засьведчаную рэзолюцыяй начальніка вайсковага сэктару т. Чарнова, перадалі Айзенштату, каб скласці плян забясьпечаньня. Нічога не зрабіўшы на гэтай заяўцы, Айзенштат перадаў яе загадчыку прадсэктару т. Альперовічу, які праз пяць дзён накіраваў яе дырэктару аб'яднаньня „Белкоопмалако" т. Максімчыку. Максімчык, толькі праз месяц налажыўшы сваю рэзолюцыю, перадаў заяўку адказнаму выканаўцу т. Левіну.

Такім чынам да выкананьня заяўкі прыступілі праз два месяцы.

П. Краўчанка, Л. Фельдман.

Барысаўская коопэрацыя не перабудавалася

Пастановы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове спажывецкай коопэрацыі не знайшлі свайго практычнага праламленьня ў працы Барысаўскага ЦРК. Аб гэтых пастановах навят не ведаюць паасобныя працаўнікі коопэрацыі.

ЦРК і ФЗМК не разгарнулі належнай масава-растлумачальнай працы на прадпрыемствах і ўстановах па пытаньню аб перабудове коопэрацыі.

Месячнік барацьбы з чаргамі праходзіць марудна. Закрыты разьмеркавальнік працуе дрэнна.

Гарадзкі закрыты разьмеркавальнік Бірэзінскага комбінату мае добрае абсталяваньне і ўсе ўмовы для нармальнага абслугоўваньня рабочых. Аднак працу ён паставіў надзвычай дрэнна. Заўсёды стаіць вялікая чарга. Маюцца частыя выпадкі грубых адносін работнікаў прылаўку да пакупцоў.

У магазыне антысанітарна захоўваюцца продукты. Разьмеркавальнік не пераведзен на гаспадарчы разрахунак. Адсутнічаюць соцыялістычныя мэтоды працы. Тое самае наглядаецца і ў астатніх закрытых разьмеркавальніках БЦРК.

Некалькі радкоў гісторыі
Да 17-га МЮД'у

РАБОЧАЯ МОЛАДЗЬ ПРЫ ЦАРСКІМ РЭЖЫМЕ

„У нас беспрацоўя сярод гарадзкое моладзі ўжо няма. У 1930 г. мы ўцягнулі ў прамысловасьць 549 тыс. вучняў школ ФЗВ, а да гэтага было 130 тыс.

... Ва ўмовах Савецкага Саюзу палітэхнізацыя ўцягваюцца ў вытворчасьць з пункту погляду комуністычнага разьвіцьця—яшчэ рабочае моладзь ў нас падпарадкавана „задачам навучаньня, выхаваньня, і ўжываецца на ўмовах роўнай аплаты з дарослымі". (Косараў).

У папках менскага губарнатара (Беларускі Дзяржаўны Гістарычны Архіў) знойдзена „справа трох невырашаных спраў падмайстраў", дзе яны скардзяцца, што працуюць у майстэрнях больш устаноўленага законам часу. У малелькіх майстэрнях пераноўленых папяровым пылам, яны працуюць без перапынку па 16-17 гадзін у суткі, з 7 гадзіны раніцы да 1 ночы, абслаючы з сьнеданьня з прапаю. З прычыны такой „разьмернай працягласьці работы, у іх не застаецца часу на адпачынак: ні на сон, які працягваецца 5 гадзін, ні на карыстаньне адзежы і кватэры.

Гаспадары, пад пагрозаю пазбавіць работы, абавязваюць іх гаварыць, нібы яны атрымліваюць за звышнармовую работу асобную ўзнагароду, чаго ў сапраўднасьці няма.

Пасьля абсьледваньня ў 1894 г. усіх пераплётных майстэрняў Менску, аказалася, што ў майстэрні Х. Гурэвіча працуюць з 8 гадзіны раніцы да 10 гадзіны ўвечары кругам год. Сьнедаюць і абедаюць у майстэрні. Таму цяжка сказаць, колькі часу ідзе на сьнеданьне і абед, ва ўсякім выпадку—не болей гадзіны.

У майстэрні Зелікина працуюць з 8 гадзіны раніцы да 11 гадз. ночы.

Падмайстры атрымліваюць ад 7 да 20 руб. у месяц на сваіх уласных харчох. Па чацьвяргох працуюць да 2 гадзіны ночы. За тэрміновую работу пасьля 10 гадзіны ночы не плацяць.

У майстэрні Хаскіна працуюць з 9 гадзіны раніцы да 12 гадз. ночы, а па чацьвяргох—да 3-е гадзіны ночы...

* * *

Наша моладзь не ведае аб усім гэтым.

Але вывучаць гісторыю мінулага неабходна, каб выхоўваць у сабе яшчэ большую ненавісьць да мінулага ладу і збудаваць сьветлую, соцыялістычную будучыню.

А. Д.

Мюдаўскі прабег па горадзе фізкультурнікаў Менску

Гарком комсамолу і Менскі гарадзкі савет фізкультуры 6-га верасьня наладжваюць прабег па горадзе. У прабегу ўдзельнічаюць усе фізкультурныя колектывы профсаюзаў, вайсковых частак, „Дынамо", вузаў, школ, піонэрскіх баз і саматужнай промкоопэрацыі.

Узрост удзельнікаў устанаўліваецца наступны: мужчыны ня менш 18 год, жанчыны ня менш 17 год і старэй: школьнікі: хлопчыкі і дзяўчаткі ня менш 15 год. Удзельнікі зьбіраюцца а шостай гадзіне ўвечары: мужчыны і жанчыны—спортпляцоўка „Профінтэрн", школьнікі—другая школа.

Маршруты прабегу

а) Мужчыны (2 кілёмэтры)—старт: рог Савецкай і Садовай Савецкая-Ленінская-Пляц волі.

б) Жанчыны (1 клм) Рог Савецкай і зав. Луначарскага Савецкая Ленінская-Пляц волі.

в) Хлопчыкі (1 клм) Рог Савецкай і Комсамольскай Савецкая-Ленінская-Пляц волі.

г) Дзяўчата (500 м) 2-я школа-Ленінская-Пляц волі.

Крос асабіста-камандны, залік ува ходзіць масавасьць і спортыўна-тэхнічныя вынікі. Лепшы колектыў прэміюецца прызам (Бюст Леніна) Акрамя таго, 50 лепшых індывідуалістых прэміююцца спорткасьцюмамі

Беларускі другі дзяржаўны тэатр

Абвяшчае прыём актораў (8) і супрацоўнікаў: мужчын (12) і жанчын (4),

Прыёмныя іспыты адбудуцца ў Гомелі 12 кастрычніка ад 11 гадзіне ў дзень.

Асобы, якія жадаюць паступіць як акторы, павінны падрыхтаваць па ўласнаму выбару адпаведны матар'ял для ўстаноўленьня іх кваліфікацыі.

Асобы, якія жадаюць паступіць як супрацоўнікі, павінны падрыхтаваць.

1) апавяданьне, альбо верш драматычнага зьместу:

2) Байку. жарт, або гумарыстычнае апавяданьне;

3) Прасьпяваць па ўласнаму выбару (хто сьпявае).

Выбар экзаменацыйнага матар'ялу можа быць ня толькі ў беларускай мове, але і ў расійскай, яўрэйскай і інш.

Заявы перасылаць па адрасу;

Менск Пляц Волі, НКАсьветы, Галоўмастацтва, БДТ2, а з 6-га кастрычніка Гомель, БДТ2

Дырэктар В. Вольскі

Маст. кіраўнік М. Міцкевіч

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599